Ларыса Доўнар

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ І КНІГАЗНАЎСТВА: ДАСЯГНЕННІ І ПАТРЭБЫ

*Разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця сучасных даследаванняў па гісторыі беларускай кнігі і кнігазнаўства; выяўляюцца праблемныя пытанні, новыя метадалагічныя падыходы і перспектыўныя кірункі даследаванняў беларускай навукі пра кнігу. Надаецца ўвага пытанню інстытуцыянальных даследаванняў у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.*

Нягледзячы на тое ці, дзякуючы таму, што беларускае кнігазнаўства – і найперш у яго складзе гісторыя беларускай кнігі – у сілу розных прычын развівалася ў цеснай узаемасувязі і нават амаль непадзельна ад такіх гуманітарных навук, як гісторыя, літаратуразнаўства, мовазнаўства, мастацтвазнаўства, філасофія, педагогіка, культуралогія і ў адзінстве з роднаснымі – бібліяграфазнаўствам і бібліятэказнаўствам, сёння мы можам з поўным правам сказаць, што назапашаны вопыт для сучасных беларускіх кнігазнаўцаў – агромісты навуковы патэнцыял для наступных даследаванняў.

Вядучымі цэнтрамі навуковых даследаванняў былі і застаюцца Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, спецыяльныя навуковыя выданні якіх папаўняюць набыткі гісторыі беларускай кнігі, беларускага кнігазнаўства. Распрацоўкай некаторых пытанняў гісторыі беларускай кнігі займаліся і вучоныя з Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Канады, ЗША і іншых краін.

Гісторыя беларускай кнігі як аб'ект вывучэння ў розных навуковых галінах – з аднаго боку, садзейнічала развіццю гісторыка-кніжных, даследаванняў, а з іншага – уносіла разнабой у выпрацоўку адзінай гісторыка-кнігазнаўчай метадалогіі і тэр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міналогіі; разам з набыткамі праяўляліся і праблемы: эпізадычнасць, несістэмнасць, нераўнамернасць даследавання тых ці іншых тэм і перыядаў у гісторыі беларускай кнігі, яе тыпа-відавога складу, крыніцазнаўчай базы, у тым ліку і нацыянальнага рэпертуару беларускай кнігі. Выкарыстанне розных методык перашкаджала, а нярэдка і выключала магчымасць параўнальнага аналізу даследаванняў, стварала дадатковыя праблемы ў фарміраванні цэласнай гісторыі кнігі Беларусі [50, с. 32]. Замест аб'екту гісторыя беларускай кнігі станавілася прадметам даследавання, дзякуючы якому будавалася гісторыя розных навуковых галін, а навуковы кнігазнаўчы воблік уласна гісторыі беларускай кнігі заставаўся размытым і слаба акрэсленым.

Тым не менш, па выніках зробленага ў галіне гісторыі беларускай кнігі вызначыліся асноўныя кірункі даследаванняў: скарыназнаўства; гісторыя кнігадрукавання; кніжныя сувязі; мастацтва старадрукаванай кнігі; крыніцазнаўства, гістарыяграфія; ахова помнікаў кніжнай культуры; бібліяфілія; навуковае апісанне фондаў рэдкай і старадрукаванай кнігі бібліятэк. Акрэслілася і кола праблемных кнігазнаўчых пытанняў – гэта прынцыпы і крытэрыі ідэнтыфікацыі нацыянальнага дакумента і развіццё бібліяграфічнага забеспячэння гісторыі беларускай кнігі; тыпалогія кнігі; тэорыя, методыка і метадалогія навукі пра кнігу. Замацавалася ўпэўненасць, што дакументальная спадчына Беларусі – важнейшы складнік існавання і развіцця нацыі; дзейнасць спецыяльных навуковых і грамадскіх цэнтраў – магутны сродак для канцэнтрацыі інтэлектуальных сіл і дасягнення плённых вынікаў; спецыялізаваныя выданні – неабходны інструмент для развіцця і распаўсюджвання ведаў; падрыхтоўка навуковых кадраў – асэнсаванне дасягнутых вынікаў і перспектыва развіцця навукі пра кнігу.

Працы апошняга 20-цігоддзя, ад пачатку 1990-х гг., сведчаць, што беларускія кнігазнаўцы імкнуцца вырашаць актуальныя пытанні вывучэння беларускай кнігі на гістарычным, тэарэтыка-метадалагічным і метадычным узроўнях. У кантэксце гісторыі беларускай кнігі робяцца спробы даследавання тэарэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігазнаўчых праблем, у якіх праяўляецца палівaрыянтнае мысленне аўтараў і іх яскрава акрэслены аксіялагічна-гнасеалагічны падыход.

Прынцыпова важнае значэнне для даследаванняў гісторыі беларускай кнігі, а таксама практыкі бібліяграфавання (уліку) кніжнага рэпертуару маюць *тэарэтычныя пытанні вызначэння паняццяў* "беларуская кніга", "нацыянальны дакумент", якія ў наш час абмяркоўваюцца вучонымі бібліяграфазнаўцамі і кнігазнаўцамі. Доктар педагагічных навук, прафесар БДУКМ В.Е. Лявончыкаў лічыць, што паняцце "беларуская кніга"[1] носіць гетэрагенны характар, змест якога ўключае наступныя сутнасныя прыметы: мову, аўтарства, тэрыторыю, змест кнігі, а таксама дадатковыя: рэдакцыйнае, тэхнічнае і мастацкае выкананне твораў друку. У сваю чаргу аб'ём паняцця ахоплівае: а) беларускамоўныя кнігі, выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі, б) кнігі на іншых мовах, напісаныя аўтарамі беларускага народа і грамадзянамі Беларусі, незалежна ад месца іх выдання, в) пераклады кніг беларускіх аўтараў на замежныя мовы і кніг замежных аўтараў на беларускую мову, г) кнігі, выдадзеныя выдавецтвамі і друкарнямі на тэрыторыі Беларускай дзяржавы і на беларускай этнічнай тэрыторыі [39, с. 17]. Безумоўна, данае вызначэнне паняцця неабходна экстрапаліраваць і на рукапісную, а не толькі на друкаваную кнігу.

Па меркаванні В.Е. Лявончыкава паняцці "беларуская кніга" і "нацыянальная кніга" не з'яўляюцца сінанімічнымі, бо ў іх аснове ляжаць адрозныя характарыстыкі: для першага выкарыстоўваецца этнанімічная, а для другога – палітанімічная, што адпаведна сведчыць аб аднясенні кнігі да пэўнага народу (нацыі), а ў іншым выпадку – да пэўнай краіны.

---

[1] Прапановы па ідэнтыфікацыі беларускай кнігі: 1965 г. – Галенчанка Г.Я.: сукупнасць адзнак: 1) тэрытарыяльнае месцазнаходжанне друкарняў, 2) змест кнігі, прызначанасць беларускаму чытачу, арыентацыя кнігавыдавецтва на беларускі рынак, 3) паходжанне аўтараў рукапісу, работнікаў друкарні, кнігавыдавецтва, нацыянальны склад работнікаў друкарні, 4) рысы нацыянальнай культуры ў афармленні, арнаментах, графіцы выданняў; 1967 г. – Жураўскі А. І., Булыка А. М.: выданні, якія ажыццяўляліся беларусамі і прызначаліся для распаўсюджання сярод беларускага насельніцтва незалежна ад месца стварэння і мовы; 1977 г. – Умецкая Я. С.: комплекс прымет: аўтар тэксту ці перакладчык, рэдакцыйнае, тэхнічнае і мастацкае яе выкананне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі было ініцыявана абмеркаванне і публікацыя зборніка артыкулаў, прысвечанах яшчэ аднай блізкай кнігазнаўчай катэгорыі – "нацыянальны дакумент"[2], які разглядаецца аўтарамі як гісторыка-культурная каштоўнасць Беларусі, што адлюстроўвае дасягненні айчыннай навукі, вытворчасці, адукацыі, узровень выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці [43]. Разам з тым дыскусію нельга лічыць завершанай, а адказы на пытанні знойдзенымі, як патрабуе таго дакладнасць практыкі бібліяграфавання і як патрабуе таго асэнсаванне гісторыі беларускай кнігі, напрыклад, у перыяды Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. У рэтраспектыве ж уліку і працы з дакументным патокам, як прапаноўвае В. М. Герасімаў, трэба змяніць прыярытэты і кіравацца не столькі тэрытарыяльна-дзяржаўным падыходам, колькі нацыянальна-экстэрытарыяльным [8].

"Недастатковая распрацаванасць спецыяльнай кнігазнаўчай тэрміналогіі на беларускай мове, адсутнасць тэрміналагічных слоўнікаў выклікала неабходнасць, – як адзначылі ў свой час Таццяна Рошчына і Наталля Саверчанка, – стварэння дапаможнага руска-беларускага слоўніка па кнігазнаўстве" [49, с. 3], а ў 2003 і 2004 гг. з'явіліся наступныя – англа-беларускі і беларуска-англійскія [61; 41]. Працягваецца – хоць і не так хутка як хацелася б – і праца па стварэнні іншых спецыяльных тэрміналагічных слоўнікаў па кнігазнаўстве, у прыватнасці па правенецыях[3].

Не губляюць сваёй актуальнасці для гісторыка-кніжных даследаванняў Беларусі і *пытанні вызначэння крытэрыяў перыядызацыі гісторыі кнігі, тыпалогія кніжных сувязяў*, якія патрабуюць сістэмнага (комплекснага) падыходу, што атрымала абгрунтава-

[2] Паняцце "нацыянальны дакумент" разглядалася і ў ранейшых працах супрацоўнікаў НББ – гл.: Чыгірова, Р. М. Да пытання вызначэння зместу паняцця "нацыянальны дакумент" / Р. М. Чыгірова, А. В. Мураўёва, Т. І. Рошчына // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1995. – С. 9-16.

[3] Рыхтуюцца да друку ў "Здабытках" распрацоўкі Юрыя Лаўрыка "Да пытання пра тэрміналогію і сістэматызацыю кніжных пазнак" паводле выступлення на круглым стале ў НББ "Даследаванне правененцый у Беларусі" (27 лістапада 2013 г.).

нае ў дысертацыйнай працы Л.І. Доўнар на прыкладзе гісторыі кнігавыдання Мінска 1795–1917 гг. [24]. Узорам глыбокага вывучэння галіновай кнігі служаць першыя ў беларускім кнігазнаўстве тэарэтыка-прыкладныя *даследаванні па тыпалогіі кнігі*: рэлігійнай – Т.А.Самайлюк [51; 53], медыцынскай вучэбнай – Н.Ю.Вайцэховіч [5], у якіх адпаведна разгортваюцца і азначэнні даных тыпаў кніг, іх функцыянальныя асаблівасці.

Гістарычны аспект адлюстроўваецца і ў такіх нераспрацаваных *прыватных пытаннях беларускага кнігазнаўства*, як "букіністычная кніга", да якой апошнім часам звярнуўся В. М.Герасімаў, раскрываючы змест паняцця антыкварна-букіністычнай кнігі праз яе класіфікацыю, крытэрыі ацэнкі і каштоўнасці [6]. Грунтоўную тэарэтычную аснову маюць працы Т.А.Сапегі, прысвечаныя тэмам "бібліяфіліі" [55] і "музея кнігі" [57-59].

Па-новаму сёння асэнсоўваюцца і пытанні *метадалогіі гісторыі беларускай кнігі і кнігазнаўства*, дзе асаблівай увагі заслугоўваюць распрацоўкі Т. А. Самайлюк – аб функцыянальнай сутнасці і ўласцівасцях рэлігійнай кнігі [53], В.М. Герасімава – па вывучэнні кнігазнаўчай спадчыны беларускага замежжа [9] і гісторыі кнігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны [7], Ю.М. Лаўрыка – па гістарычным кнігазнаўстве і кнігазборах Беларусі [33-37], а таксама Л. І. Доўнар – аб пытаннях персанальнага [15; 18; 21] і рэгіянальнага кнігазнаўства [25].

Сучасныя даследаванні гісторыі беларускай кнігі парадыгмальна скіраваны да такой катэгорыі як *кніжная культура*, аб чым сведчаць працы М. В. Нікалаева – па кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага [44; 45; 47], Т. А. Самайлюк – пра феномен рэлігійнай кніжнасці ў культуры [51], Т. А. Сапегі – пра феномен друкаванай кнігі [56], Л. І. Доўнар – аб філасофска-культуралагічных падыходах у вывучэнні беларускай кнігі [14], беларускай кнізе як універсуме культуры [10], якія могуць паслужыць пэўнай метадалагічнай асновай у раскрыцці шматаспектнага і сістэмнага прадмета гісторыі беларускай кнігі ў кантэксце сацыякультурнай прасторы, дзе культура разумеецца як цэласнае і рухомае адзінства духоўнага, мастацкага і матэрыяльнага яе пластоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У шэрагу не толькі самых заўважных сучасных праектаў па *агульнай гісторыі беларускай кнігі*, але і гістарычна важных для развіцця навукі пра кнігу ў Беларусі – навуковая праца ў двух тамах “Гісторыя беларускай кнігі” (Мінск, 2009, 2011), выдадзеная па ініцыятыве і пад агульнай рэдакцыяй доктара філалагічных навук М. В. Нікалаева, якому належыць грунтоўнае даследаванне гісторыі рукапіснай кніжнасці Беларусі: манаграфія “Палата кнігапісная. Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях” (Мінск, 1993) [46]. Новае выданне вучонага – “Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага” (2009) [45], уяўляе з сябе гісторыю кніжнай культуры ВКЛ, заснаваную на вывучэнні рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў, багата праілюстраваных у манаграфіі, – выйшла як першы том у складзе названай калектыўнай працы “Гісторыя беларускай кнігі”. Другі том – “Кніжнасць новай Беларусі XIX–XXI стст.” (Мінск, 2011) [30], аўтарамі якога з’яўляюцца М. В. Нікалаеў, Л. І. Доўнар, М. А. Лукоўская і Р. С. Матульскі, прысвечана беларускай кніжнай культуры з часу ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі і да нашых дзён. Упершыню ў Беларусі з’явілася падобная комплексная навуковая праца па гісторыі кніжнай культуры: ад старажытных рукапісных да сучасных кніг, ад іх стварэння да распаўсюджання і захавання, якая адначасова засведчыла і шэраг яшчэ не вырашаных праблем: тэарэтычных, гістарычных і практычных, якія стаяць перад кніжнай культурай Беларусі і перад яе даследчыкамі.

Адным жа з шляхоў, які дае шанц набліжэння да найбольш праўдзівых абрысаў гісторыі кнігі, кніжнай культуры – *рэгіянальны, лакальны падыход*. На нашу думку, без развіцця лакальных кнігазнаўчых даследаванняў – як абагульняючых, так і ў межах прыватных тэм, нельга ўявіць усю паўнату ўкладу, унесенага мясцовымі выдаўцамі, кнігарамі, бібліяфіламі ў развіццё айчыннай культуры і асветы; асэнсаваць ролю кнігі ў сацыяльных пераўтварэннях грамадства. Лакальныя, рэгіянальныя даследаванні гісторыі кнігі і кніжнай культуры, заснаваныя на мясцовым матэрыяле, узбагачаюць карціну навуковых прац у вызначаных галінах, спрыяюць высвятленню асаблівага, разнастайнага і агульнага ў гісторыка-культурным развіцці Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спробай рэалізацыі комплекснага падыходу ў галіне даследавання кніжнай культуры пэўнага рэгіёна Беларусі стала міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання", арганізаваная двойчы Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага ў 2008 г. і 2012 г. Упершыню ў рэгіянальным кнігазнаўстве Беларусі кніга прадстаўлена ў рэтраспектыве і перспектыве стварэння, бытавання, распаўсюджання, захоўвання і захавання; у кантэксце гісторыі і культуры рэгіёна, тэрыторыі [1; 2]. Адной з задач на шляху рэгіянальных кнігазнаўчых даследаванняў з'яўляецца задача "не згубіцца", не расцерушыць у агульнай масе краязнаўчай інфармацыі веды пра кнігу, а наадварот, выкарыстоўваючы краязнаўчы матэрыял[4], паглыбляць іх, дадаючы новыя рэгіянальныя асаблівасці ў адзіную карціну гісторыі кнігі Беларусі.

З пункту гледжання выкарыстання метадалогіі рэгіянальнага падыходу ў вывучэнні кнігазбораў карыснай з'яўляюцца і публікацыі беларускай даследчыцы з Кракава Ліліі Коўкель пра кнігазборы Гродзеншчыны, у прыватнасці – манаграфічная праца "Прыватныя кнігазборы на Гродзеншчыне ў першай палове XIX стагоддзя", якая выйшла ў кракаўскім друку ў 2005 г. [27]. Асноўнай мэтай працы стала "комплексная рэгістрацыя" існаваўшых на гродзенскіх абшарах у азначаны перыяд прыватных калекцый кніг, сістэматызацыя матэрыялаў, якія датычаць іх уладальнікаў, спосабаў фарміравання кнігазбораў, іх структуры і лёсаў.

Асаблівую ўвагу прыцягваюць публікацыі пра "найдаўнейшыя беларускія кніжніцы" Ю. Лаўрыка [32; 35; 37], якія з'яўляюцца, бадай, аднымі з першых спроб абагульнення звестак у храналогіі існавання прыватных кнігазбораў на тэрыторыі Беларусі, іх сістэматызацыі па ўладальніцкай прыналежнасці і раскрыцці асноўных тэндэнцый развіцця. Нядаўняя манаграфія Ю. Лаўрыка, прысвечаная выдавецкай і кнігазбіральніцкай дзейнасці ў Куцейне ў сярэдзіне XVII ст. [36], прадаўжае традыцыі класічных прац

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[4] Напрыклад: *Полипский, А.* Книга в Витебске (Книгоиздательство, библиотеки и книголюбы Витебска). Дооктябрьский период / Аркадий Михайлович Подлипский ; Витебская областная библиотека ; Витебский краеведческий фонд имени А. Сапунова. – Витебск, 1999. – 64 с.

па гісторыі кнігі, такіх аўтараў і папярэднікаў, як, напрыклад, Леў Уладзіміраў ці Мікола Нікалаеў, якім характэрны *комплексны падыход да гісторыі кнігі*: ад яе стварэння да распаўсюджвання. Дарэчы, манаграфія літоўскага вучонага Л. Уладзімірава з'яўляецца адзінай у сваім родзе "Усеагульнай гісторыяй кнігі", якая ўключае і гісторыю беларускай кнігі (да XVIII ст.)[5].

Сістэмны падыход неабходны і ў даследаваннях гісторыі беларускай кнігі ў кантэксце разнамоўнай кніжнай спадчыны Беларусі, якая не забяспечана адпаведнымі айчыннымі працамі. Выключэнне хіба што складаюць працы аб мінскіх разнамоўных выданнях канца XVIII – пачатку XX ст., у іх ліку на яўрэйскай мове (Л. І. Доўнар) [24] і пра арабаграфічную кніжную прадукцыю Беларусі (А. Цітавец) [64]. На праблемы вывучэння традыцыйнай яўрэйскай кніжнай культуры звярнуў увагу і Ю. М. Лаўрык [34]. Дапаўняюць даны кірунак даследаванні асаблівасцяў мастацкага афармлення кніг С. Леонцьевай [38] і І. А. Сынковай [63].

Важкім стымулам развіцця і пашырэння навуковай працы ў галіне кніжнай культуры Беларусі з'яўляецца праектная дзейнасць. Да прыкладу варта прыгадаць навукова-даследчы праект Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – "Кніжная культура Беларусі: гісторыка-тэарэтычны аспект" (2006–2010 гг.) [13], Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі – расійска-беларускі праект "Книжная культура Росии и Беларуси в контексте историко-культурного взаимодействия" (2010–2012 гг.), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – даследаванне гісторыі і сучаснага стану бібліятэчнай справы і кніжнай культуры Беларусі ў рамках Дзяржаўнай праграмы "Культура" на 2011–2015 гг.) [28].

Вынікамі ажыццяўлення навукова-даследчай работы ў БДУКМ – аддзелам рэдкіх кніг бібліятэкі – сталі праведзеныя навуковыя кнігазнаўчыя канферэнцыі (2006 і 2007 гг.), штогадовыя

---

[5] *Vladimirovas, L.* Knygos istorija: Senovė. Viduramžiai. Renesansas. XVI–XVII amžius / Levas Vladimirovas. – Vilnius : Mokslas, 1979. – 544 p. : il.; *Владимиров, Л. И.* Всеобщая история книги. Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век / [пер. Н. Л. Владимировой]. – Москва : Книга, 1988. – 322 с. : ил.

Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні; апублікаваныя зборнікі навуковых прац "Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры" (чатыры выпускі за 2006, 2008, 2011 і 2012 гг.). Упершыню ў Беларусі выдадзены вучэбны дапаможнік "Гісторыя беларускай кнігі", які цэласна ахоплівае ўсе перыяды развіцця беларускай кнігі ад распаўсюджання пісьменства да сучаснасці (XI–XXI стст.) [19].

У ЦНБ НАНБ адбыліся такія навуковыя канферэнцыі, як "Книга – источник культуры: проблемы и методы исследования" [29], "Славянское книгопечатание и культура книги" [56], "Беркавские чтения" [3; 4]; навуковы семінар "Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития" [62]; апублікавана калектыўная манаграфія "Книжная культура России и Беларуси в контексте историко-культурного взаимодействия" (Минск ; М., 2013); распачатата новая тэма НДР "Книжная культура в контексте инновационного развития общества" (2014–2015 гг.).

У НББ наладжаны сістэматычныя Міжнародныя Кнігазнаўчыя Чытанні (з 1998 г.) і публікацыя іх матэрыялаў (да 2014 г. выйшла 10 выданняў), выпускаецца рэцэнзаваны навуковы зборнік "Здабыткі. Дакументальныя помнікі Беларусі" (з 1995 г.) [54]. У якасці дзяржаўнага задання НББ выконвае НДР па адзначанай вышэй тэме і займаецца распрацоўкай інфармацыйнага рэсурса па гісторыі бібліятэчнай справы і кніжнай культуры Беларусі (XI–XXI стст.), стварэннем аптымізаванай мадэлі функцыянавання бібліятэк Рэспублікі Беларусь [28], што дазваляе спадзявацца на правядзенне грунтоўных крыніцазнаўчых і гістарыяграфічных падсумаванняў у галіне кніжнай культуры Беларусі. Цалкам жа вопыт актыўнай навуковай камунікацыі ўзмацняе і садзейнічае росту кнігазнаўчага патэнцыялу ў Беларусі.

Неабходнай падставай для гэтага з'яўляецца і праца названых бібліятэк па дапаўненні і складанні рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў (у іх ліку і на CD-ROM)[6], якая

---

[6] Напрыклад: Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации = Library of the Radziwills' of Nesvizh Ordynation : каталог изданий из фонда Центральной Научной библиотеки им. Я. Коласа Национальной академии наук Беларуси, XV–XVI века / Национальная академия наук Беларуси, Центральная Научная библиотека им. Якуба Коласа ; сост.: А. В. Стефанович, М. М. Лис ; ред. библиогр. записей О. М. Дрозд ; редкол.: Н. Ю. Березкина (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актывізавалася апошнім часам і паказвае значныя вынікі, што ў сваю чаргу паслужаць наступным гісторыка-кніжным даследаванням, як у свой час супольна і ва ўзаемадзеянні развіваліся бібліяграфічныя і кнігазнаўчыя веды [12; 22].

Сучасным даследаванням па гісторыі беларускай кнігі і кнігазнаўстве характэрны наступныя тэндэнцыі:

- колькасны і якасны рост навуковых прац агульнага і рэгіянальнага характару, парадыгмальнай асновай якіх выступае кніжная культура;
- пошук новых метадалагічных прынцыпаў даследаванняў, заснаваных на вывучэнні кнігі ў кантэксце сацыякультурнай прасторы, дзе культура разумеецца як цэласнае і рухомае адзінства духоўнага, мастацкага і матэрыяльнага яе пластоў;
- выкарыстанне комплекснага падыходу і сістэмнага крытэрыя разгляду гісторыі кніжнай культуры Беларусі, у кантэксце якой робяцца спробы абгрунтавання розных феноменаў і працэсаў беларускай кніжнасці ў яе гістарычным развіцці, набліжаных да культурнага універсума (суіснаванне ў шматнацыянальным, поліканфесійным асяроддзі і культурная талерантнасць);

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

2010. – 175 с. : ил.; Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации = Library of the Radziwills' of Nesvizh Ordynation : каталог изданий из фонда Центральной Научной библиотеки им. Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси, XVII век / Национальная академия наук Беларуси, Центральная Научная библиотека им. Якуба Коласа ; сост.: А. В. Стефанович, М. М. Лис; ред. библиогр. записей О. М. Дрозд, И. Л. Мурашова ; редкол.: Н. Ю. Березкина (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 629 с. : ил.; *Киреева, Г. В.* Книги кирилловского шрифта XVI – начала XX в. в собраниях Национального художественного музея Республики Беларусь : альбом-каталог / Г. В. Киреева, Н. Я. Трифонова ; под науч. ред. Г. Я. Голенченко, Е. В. Карпенко ; Нац. худож. музей Республики Беларусь. – Минск : Белпринт, 2012. – 168 с. : ил.; Библиотека Хрептовичей [Электронный ресурс] : книжное собрание рода Хрептовичей / Нац. б-ка Беларуси, Нац. б-ка Украины им. В. И. Вернадского ; сост.: Кирюхина Л. Г., Дубровина Л. А.; под науч. ред. Л. Г. Кирюхиной, Т. И. Рощиной. – Электрон. текстовые дан. – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2009. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – Загл. с этикетки диска; Сапегиана: книжное собрание рода Сапег [Электронный ресурс] = Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў / Нац. б-ка Беларуси, Рос. нац. б-ка ; сост.: Л. Г. Кирюхина, К. В. Суша ; под науч. ред. Н. В. Николаева, Т. И. Рощиной ; авт. ст.: Н. В. Николаев, Н. Н. Проневич. – Электрон. текстовые, граф. данные и программа (1,73 Мб). – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2011. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – Загл. с этикетки контейнера; Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларуси, НДА кнігазнаўства ; склад. каталога: Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч ; склад. электрон. выд.: Г. У. Кірэева, А. А. Суша, К. В. Языковіч ; адказ. рэд. Г. У Кірэева. – Электрон. тэкставыя, граф. даныя і праграма (196 Мбайт). – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2006. – 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM); 12 см. – Сістэмныя патрабаванні: Intel Pentium 333; Windows 95; RAM 128; SVGA; 32x CD-ROM.

- папаўненне корпусу агульна- і прыватна кнігазнаўчых тэарэтычных распрацовак, неабходных для гісторыка-кніжных даследаванняў – гэта ўдакладненне кнігазнаўчай тэрмінасістэмы, вызначэнне паняццяў "беларуская кніга" і "нацыянальны дакумент"; абгрунтаванне крытэрыяў перыядызацыі гісторыі кнігі Беларусі; удакладненне тыпалогіі беларускай кнігі; вызначэнне стратэгіі работы з гістарычнымі фактамі, заснаванай на адзінай метадалогіі аналізу і вывучэння гістарыяграфічнага і крыніцазнаўчага матэрыялу;
- пашырэнне метадаў і метадалогіі гісторыка-кніжных даследаванняў, якія патрабуюць міждысцыплінарнага, кампаратыўнага падыходу, выкарыстання навуковых вынікаў і ўзаемадзеяння з такімі галінамі навук, як філасофія, культуралогія, гісторыя, філалогія, адукацыя, мастацтвазнаўства і інш., што спрыяе ўвядзенню ў навуковы ўжытак не толькі новых матэрыялаў, але і дазваляе па-новаму раскрыць шматзначнасць і шматфункцыянальнасць айчыннай кніжнасці (і кніжнікаў) у развіцці навукі, культуры, адукацыі; цалкам у захаванні маральных і духоўных каштоўнасцей грамадства.

Відавочна, што даследчае поле гісторыі беларускай кнігі і кнігазнаўства як пашыраецца, так і ўскладняецца не столькі з пункту гледжання метадалогіі, колькі з-за пэўнай супярэчнасці паміж неабходнасцю высокага ўзроўню навуковага аналітыка-сінтэтычнага пераасэнсавання і існуючымі прагаламі ў вывучэнні адпаведнага матэрыялу, а таксама з-за слабога айчыннага інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння кнігазнаўчых даследаванняў [48]. Калі арыентавацца на такі прадмет даследавання як кніжная культура, то тут неабходна не толькі выкарыстоўваць данае словазлучэнне ці механічна спалучаць гісторыю стварэння, распаўсюджання і бытавання кнігі, але і напаўняць яго абагуленым кампаратыўным сэнсам. Бо, як адзначаецца вядомымі кнігазнаўцамі, "параўнальнае вывучэнне кніжнай культуры мінулага і сучаснага магчыма толькі на аснове разумення адзінства і прызнання разнастайнасці свету культуры і свету кніг" [42, с. 33].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з чым сярод актуальных патрэб сучаснасці ў развіцці беларускага кнігазнаўства абазначаюцца наступныя кірункі[7]:

- даследаванне гісторыі развіцця беларускай навукі пра кнігу, у тым ліку – гэта вызначэнне асноўных прац па гісторыі кнігазнаўства Беларусі, навуковыя каментарыі, аналіз кнігазнаўчых прац мінулага, іх пераклад на беларускую мову,
- вывучэнне беларускага агульнага, спецыяльнага і прыватнага кнігазнаўчага (тэарэтыка-метадалагічнага) вопыту, на аснове чаго неабходна выпрацаваць прынцыповыя падыходы да фундаментальных тэрміналагічных пытанняў, беларускай кнігазнаўчай тэрмінасістэмы, вызначыць стратэгію работы з гістарычнымі фактамі,
- даведкавае і бібліяграфічнае забеспячэнне гісторыі беларускага кнігазнаўства – гэта (у тым ліку і гісторыі беларускай кнігі – завяршэнне працы па складанні рэпертуару шматмоўнай, рукапіснай і друкаванай кнігі, адпаведных крыніцазнаўчых, гістарыяграфічных і бібліяграфічных баз даных), стварэнне кнігазнаўчай энцыклапедыі [13, с.129], тэрміналагічных слоўнікаў, спецыяльных даведнікаў, бібліяграфічных рэсурсаў па гісторыі беларускага кнігазнаўства,
- каардынацыя навуковай кнігазнаўчай дзейнасці, у тым ліку – кансалідацыя і ўдасканаленне падрыхтоўкі навуковых кадраў,
- развіццё міжнародных кнігазнаўчых сувязей у галіне вывучэння кніжнай спадчыны, распрацоўкі міжнародных праектаў і ўдзелу ў канферэнцыях, публікацый навуковых работ, абмену кнігазнаўчым вопытам, перакладаў на беларускую мову замежных навуковых кнігазнаўчых прац.

У працэсе вырашэння вызначаных кірункаў кантэнт беларускай навукі пра кнігу будзе толькі ўзбагачацца тэрміналагічна і змястоўна, атрымае новае развіццё, дапоўніць і паспрыяе абагульняючым працам па ўсеагульнай бібліялогіі, а таксама будзе карысным і для практыкі кніжнай справы Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Гл. таксама паводле спіса выкарыстаных крыніц: №№ 17 ; 48.

1. Берасцейскія кнігазборы : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. "Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання" (Брэст, 30–31 кастр. 2008 г.) / УК "Абласная бібліятэка імя М. Горкага" ; склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька; [пад агул. рэд. М. В. Нікалаева]. – Брэст : Паліграфіка, 2010. – 463 с. : іл.

2. Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання : матэрыялы і даклады II Міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 31 мая – 3 чэрв. 2012 г.) / Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт, Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна ; склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька ; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. – Брэст : БрДУ, 2013. – 464 с. : іл.

3. Берковские чтения, 2011. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–26 мая 2011 г.). – Минск : Центральная научная библиотека НАН Беларуси ; Москва : Изд-во "Наука", Фонд "Книжная культура", 2011. – 423 с.

4. Берковские чтения, 2013. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 16–17 мая 2013 г.). – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; Москва : ФГБУ науки НИЦ "Наука" РАН, 2013. – 496 с.

5. *Вайцехович, Н. Ю.* Медицинская учебная книга в системе высшего образования : дис. ... канд. пед. наук : 05.25.03 / Вайцехович Надежда Юрьевна ; науч. рук. Касап В. А. – Минск : [б. и.], 2012. – 155 л. : табл. + 1 т. прил. (406, [7] л.). – Библиогр.: с.119-155 (417 назв.).

6. *Герасімаў, В. М.* Букіністычная кніга: свет – Беларусь – гісторыя – сучаснасць – перспектывы / В. М. Гераісмаў // Материалы VI Международных книговедческих чтений "Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса", Минск, 27–29 окт. 2010 г. / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2010. – С. 148–155.

7. *Герасімаў, В. М.* Друк Беларусі 1941–1945 гг. у фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь як аб'ект бібліяграфічнай і культурнай ідэнтыфікацыі / В. М. Гераісмаў // Духоўныя асновы сучаснай культуры: праблемы захавання культурнай спадчыны. XVI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 26-28 мая 2010 г.) : у 2 т. / рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.), Т. М. Бабіч, Л. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 1. – С. 114–126.

8. *Герасімаў, В. М.* Нацыянальная кніга ў аддзеле старадрукаў і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь / В. М. Герасімаў // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2010. – С. 146–158.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Герасімаў, В. М.* Да праблемы гістарыяграфіі кнігазнаўства беларускага замежжа / В. М. Герасімаў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – Ч. 2. – С. 108–114.

10. *Довнар, Л.* Белорусская книга как универсум национальной культуры / Л. Довнар // Knygotyra. – Vilnius, 2010. – Т. 54. – С. 161–172. – Библиогр.: с. 170–171. – Рез. на англ. и лит. яз. – Таксама: Беларуская кніга як універсум нацыянальнай культуры / Л. І. Доўнар // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ (3 снежня 2010 г.) : у 2 т. / рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 2. – С. 92–96.

11. *Довнар, Л.* Белорусское книговедение и национальное возрождение 1920-х годов / Л. Довнар // Knygotyra. – Vilnius, 2007. – Т. 48. – С. 53–66. – Библиогр.: с. 63–64.

12. *Довнар, Л. И.* Книговедческое знание и белорусская библиография: источники и ориентиры / Л. И. Довнар // Труды Международного библиографического конгресса (Санкт-Петербург, 21-23 сентября 2010 г.) / Российская нац. б-ка. – Санкт-Петербург : Российская нац. б-ка, 2012. – Ч. 3 : Библиографические исследования в гуманитарных науках ; Источниковедение в библиографии ; Библиографические аспекты изучения книжной культуры ; История библиографии. – С. 238–248. – Библиогр.: с. 245–248.

13. *Довнар, Л. И.* Книжная культура Беларуси: концептуальные основы и пути реализации научного проекта Белорусского государственного университета культуры и искусств / Л. И. Довнар, Т. А. Самойлюк // Книга – источник культуры. Проблемы и методы исследования : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–27 ноября 2008 г.). – Москва ; Минск, 2008. – С. 123–131.

14. *Довнар, Л. И.* Книжная культура как философско-культурологическая категория библиологии (к постановке проблемы) / Л. И. Довнар // Наука о книге. Традиции и инновации: К 50-летию сборника "Книга. Исследования и материалы" : материалы XII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения (Москва, 28–30 апреля 2009 г.) : в 4 ч. – Москва : Наука, 2009. – Ч. 1. – С. 462–465. – Таксама: Кніжная культура як філасофска-культуралагічная катэгорыя бібліялогіі // Культура. Наука. Творчество : материалы III Междунар. науч.-практ. конф. (23–24 апр. 2009 г.). – Мінск : БДУКМ, 2009. – С. 203–207.

15. *Довнар, Л. И.* О роли личности в развитии науки о книге, или Штудии Кшиштофа Мигоня / Лариса Довнар // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 25–26 мая 2011 г.). – Минск : Центральная научная библиотека НАН Беларуси ; Москва : Изд-во "Наука", Фонд "Книжная культура", 2011. – С. 124–128.

16. *Доўнар, Л. І.* Беларуская кніга як універсум нацыянальнай культуры / Л. І. Доўнар // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ (3 снеж. 2010 г.) : у 2 т. / рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 2. – С. 92–96.

17. *Доўнар, Л. І.* Беларуская навука пра кнігу: набыткі і патрэбы / Л. І. Доўнар // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы Междунар. науч. семинара (Минск, 2-3 арп. 2014 г.). – Минск : Центральная научная библиотека НАН Беларуси ; Москва : ФГБУ Научный и издательский центр "Наука" РАН, 2014. – С. 18-21. – Рэз. англ.

18. *Доўнар, Л. І.* Беларуская навука пра кнігу ў кантэксце персанальнага кнігазнаўства / Л. І. Доўнар // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 107-119.

19. *Доўнар, Л. І.* Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; Л. І. Доўнар. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 252 с.

20. *Доўнар, Л. І.* Кніга беларускага замежжа: вызначэнне асноўных тэндэнцый у кнігавыданні / Л. Доўнар, В. Герасімаў // Новае слова ў беларусістыцы. Гісторыя і культуралогія : матэрыялы V Міжнар. кангрэса беларусістаў, Мінск, 20–21 мая 2010 года / Міжнародная асацыяцыя беларусістаў ; [пад рэд. А. А. Сушы ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч і інш.]. – Мінск : Четыре четверти, 2012. – С. 168-176. – (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 33). – Бібліягр. у канцы арт.

21. *Доўнар, Л. І.* Кшыштаф Мігань і Беларусь / Л. І. Доўнар // Кшыштаф Мігань = Krzysztof Migoń : біябібліягр. паказ. (1960–2010) : да 70-годдзя з дня нараджэння і 50-годдзя навуковай дзейнасці / склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – С. 39–46.

22. *Доўнар, Л. І.* Праблемнае поле беларускай кнігазнаўчай навукі і адукацыі / Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып.1] : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – Ч. 2. – С.204–209.

23. *Доўнар, Л. І.* Развіццё беларускай навукі пра кнігу ў 1920-я гады / Л.І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1] : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – Ч. 2. – С. 114–123.

24. *Доўнар, Л. І.* Развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці ў Мінску (1795-1917): кнігазнаўчы аспект : дыс. ... канд. пед. навук : 05.25.03 / Доўнар Ларыса Іосіфаўна. – Мінск, 2005. – 383, [5] арк. : табл. – Бібліягр.: арк. 100-128 (522 назв.).

25. *Доўнар, Л. І.* Рэгіянальныя даследаванні гісторыі кнігі ў Беларусі: да пытання аб рэгіянальным кнігазнаўстве / Л. І. Доўнар // Материалы VII Международных книговедческих чтений "Библиотеки и политика открытого доступа к информации и знаниям" (Минск, 10-11 ноября 2011 г.) / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2011. – С. 62–71.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

26. *Доўнар, Л. І.* Сутнаснае прызначэнне кнігі і мовы як з'яваў культуры: ад замацаванай інфармацыі да трансляцыі і пераемнасці ведаў/ Л. І. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: вывучэнне і захаванне : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – [Вып. 4]. – С. 32–48. – (XVIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры па тэме "Кніга ў фарміраванні духоўнай культуры і дзяржаўнасці беларускага народа" (Мінск, 16–18 мая 2012 г.) : у 2 т. ; т. 2).

27. *Доўнар, Л.* Рэц. на кн.: Kowkiel, Lilia. Prywatne księgozbiory na Grodzięszczynie w pierwszej połowie XIX wieku. Kraków : Wyd-wo Naukowe Akademii Pedag., 2005. 221 s., ill., mapa // Беларускі гістарычны агляд. –2005. – Т.12, сш.1–2 (22–23). – Снежань. – С. 299–315.

28. *Кирюхина, Л. Г.* Перспективы исследования истории и современного состояния библиотечного дела и книжной культуры Беларуси в рамках Государственной программы "Культура на 2011–2015 гг. / Л. Г. Кирюхина, А. А. Суша, М. Г. Алейник // Материалы VI Международных книговедческих чтений "Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса", Минск, 27–29 октября 2010 г. / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2010. – С. 128–133.

29. Книга – источник культуры: проблемы и методы исследования : материалы Международной научной конференции (Минск, 25-27 ноября 2008 г.) / редкол.: Л. А. Авгуль, Д. Н. Бакун, Н. Ю. Березкина (сопредс.), В. И. Васильев (сопредс.), В. В. Гниломедов, В. Я. Голенченко, М. А. Ермолаева, Н. М. Мышковская, Е. Л. Немировский. – Москва : Наука, 2008. – 415 с.

30. Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М.В.Нікалаеў, Л. І. Доўнар, М. А. Лукоўская, Р. С. Матульскі ; навук. рэд. В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 436 с. : іл. – (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. ; т. 2).

31. *Кузьмініч, Т. В.* Нацыянальны электронны дакумент як аб'ект дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / Т. В. Кузьмініч // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2010. – С. 52–61.

32. *Лаўрык, Ю.* Бібліятэкі на Беларусі ў 2-ой пал. XVI – 1-ай пал. XIX ст. : (нарыс тэндэнцый развіцця) / Ю. Лаўрык // Наша вера. – 2007. – № 2 (40). – С. 68-71.

33. *Лаўрык, Ю. М.* Гістарычнае кнігазнаўства як самастойная навука: да пастаноўкі праблемы / Ю. М. Лаўрык // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – Вып. 5. – С.34-43.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

34. *Лаўрык, Ю. М.* Да праблемы вывучэння традыцыйнай габрэйскай кніжнай культуры на беларускіх землях / Ю. М. Лаўрык // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы Междунар. науч. семинара (Минск, 2-3 апр. 2014 г.). – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; Москва : ФГБУ науки Научный и издательский центр "Наука" РАН, 2014. – С. 30-34.

35. *Лаўрык, Ю.* "Книг вшеляких русских, польских и латинских..." Прыватныя бібліятэкі праваслаўных іерархаў Рэчы Паспалітай канца XVI – 1-й паловы XVII ст. / Юры Лаўрык // Роднае слова. – 2012. – № 3. – С. 5-8.

36. *Лаўрык, Ю. М.* Кнігі і кнігазборы Куцеінскага манастыра ў сярэдзіне XVII ст. / Ю. М. Лаўрык. – Мінск : Тэхналогія, 2012. – 255 с. : іл.

37. *Лаўрык, Ю.* Найдаўнейшыя беларускія кніжніцы / Юрась Лаўрык // Роднае слова. – 2006. – № 2. – С. 78-81 ; №4. – С.80-83.

38. *Леонтьева, С. И.* Искусство рукописной книги Ветки XVIII – начала XX века : автореф. дис. ... канд. искусствовед. : 17.00.04 / С. И. Леонтьева ; НАН Беларуси, Ин-т искусствовед., этногр. и фольклора. – Минск, 2009. – 27 с.

39. *Лявончыкаў, В. Е.* Беларуская кніга: падыходы да вызначэння зместу і аб'ёму паняцця / В. Е. Лявончыкаў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1] : у 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Дзем'яновіч Т. А., Доўнар Л. І., Самайлюк Т. А. – Мінск, 2006. – Ч. 1. – С. 13–19.

40. *Лявончыкаў, В. Е.* Нацыянальны дакумент: падыходы да вызначэння зместу и аб'ёму паняцця / В.Е. Лявончыкаў // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2010. – С. 11-21.

41. Матэрыялы да англійска-беларускага тэрміналагічнага слоўніка па гісторыі кнігі і гістарычным кнігазнаўстве / уклад. Ю. Лаўрык // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 2004. – Вып. 6. – С. 300-316.

42. *Мігань, К.* Кніжная культура – спроба акрэслення паняцця як навуковай катэгорыі / Кшыштаф Мігань ; пер. з пол. мовы Л. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мінск, 2011. – [Вып. 3]. – С. 17–38.

43. Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2010. – 228 с.

44. *Нікалаеў, М. В.* Гісторыя кніжнай культуры Беларусі: праблемы і перспектывы даследаванняў / М. В. Нікалаеў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1] : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т.А. Дзем'яновіч, Л.І. Доўнар, Т.А. Самайлюк. – Мінск, 2006. – Ч. 1. – С. 19–30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

45. *Нікалаеў, М. В.* Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў ; навук. рэд. В. В. Антонаў, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 423 с. : іл. – (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. ; т. 1).

46. *Нікалаеў, М. В.* Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 239 с.: іл.

47. *Николаев, Н. В.* Книжная культура Великого Княжества Литовского : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 05.25.04 / Николаев Н. В. ; Санкт-Петерб. гос. акад. культуры. – Санкт-Петербург, 1997. – 40 с.

48. *Рошчына, Т. І.* Інфармацыйна-бібліяграфічныя патрэбы беларускага кнігазнаўства / Т. І. Рошчына // Материалы II Международного конгресса "Библиотека как феномен культуры" (Минск, 22-23 октября 2014 г.) / Нац. б-ка Беларуси ; сост. А. А. Суша. – Минск, 2014. – С. 132-137.

49. Руска-беларускі тэрміналагічны слоўнічак па кнігазнаўстве : дапаможнік у апрацоўцы старадрукаў і рэдкіх выданняў / Нац. б-ка Беларусі ; уклад.: Т. Рошчына, Н. Саверчанка. – Мінск, 1997. – 27 с.

50. *Самайлюк, Т. А.* Да пытання вывучэння гісторыі беларускай кнігі / Т. А. Самайлюк // Бібліятэка і нацыянальная праграма "Спадчына" : матэрыялы навук.-практ. канф. Мінск, 5-6 чэрв. 1991 г. / Дзярж. б-ка Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1992. – С. 31-35.

51. *Самойлюк, Т. А.* Религиозная книга как книговедческая категория / Т. А. Самойлюк // Наука о книге. Традиции и инновации : материалы Двенадцатой Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения, 28–30 апреля 2009 г, г. Москва : К 50-летию сборника "Книга. Исследования и материалы" : в 4 ч. / Совет по книгоизданию при Международной ассоциации академий наук. – Москва : Наука, 2009. – Ч. 1. – С. 277–281.

52. *Самойлюк, Т. А.* Православная книга в Беларуси / Т. А. Самойлюк. - Минск: Православ. Братство в честь Святого Архистратига Михаила, 2005. – 128 с.

53. *Самойлюк, Т. А.* Функциональная сущность и свойства религиозной книги / Т. А. Самойлюк // Матэрыялы Трэціх Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў "Кніга Беларусі: Повязь часоў" (Мінск, 16–17 верас. 2003 г.) / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск, 2005. – С. 105–117.

54. *Сапега, Т. А.* Белорусский книговедческий сборник "Здабыткі" (1995–2013) / Т. А. Сапега // Книга в информационном обществе : материалы XIII Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения (Москва, 28-30 апр. 2014 г.): в 4 ч. / отв. ред. В. И. Васильев ; сост. Д. Н. Бакун, М. А. Ермолаева. – Москва : ФГБУ науки НИЦ "Наука" РАН, 2014. – Ч. 1. – С. 90-91.

55. *Сапега, Т. А.* Бібліяфільства як любоў да кнігі і мастацтва бібліяфільскай кнігі / Т. А. Сапега // Мастацтва : [зб. арт.] / склад.: А. Р. Гуляева, С. І. Колбышава. – Мінск, 2009. – С. 30–33.

56. *Сапега, Т. А.* Друкаваная кніга як феномен культуры / Т. А. Сапега // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1]:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т.А. Дзем'яновіч, Л.І. Доўнар, Т.А. Самайлюк. – Мінск, 2006. – Ч. 2. – С. 56–68.

57. *Сапега, Т. А.* Крытэрыі адбору кніжных помнікаў для экспанавання / Т. А. Сапега // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. – Вып. 11. – Мінск, 2009. – С. 282–292.

58. *Сапега, Т. А.* Навукова-даследчая дзейнасць Музея кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: перспектыўныя кірункі развіцця / Т.А. Сапега // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т.А. Дзем'яновіч, Л.І. Доўнар, Т.А. Самайлюк ; рэдкал.: Б.У. Святлоў [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 2. – С. 90–99.

59. *Сапега, Т. А.* Экспазіцыйныя праекты музея кнігі як частка навуковай і культурнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / Т. А. Сапега // Материалы VI Международных книговедческих чтений "Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса", Минск, 27–29 октября 2010 г. / Нац. б-ка Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2010. – С. 178–183.

60. Славянское книгопечатание и культура книги : материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 16–18 сент. 2009 г.) / редкол.: Л.А. Авгуль, Д. Н. Бакун, Н. Ю. Березкина (сопредс.), В. И. Васильев (сопредс.), В. Я. Голенченко, М.А. Ермолаева, Н. М. Мышковская, Е.Л. Немировский, А.В. Стефанович. – Москва : Наука, 2009. – 96 с.

61. Слоўнік выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў : англ.-беларус., беларус.-англ. / уклад. К. Санько ; навук. рэд. А. Зьмітровіч. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 93 с.

62. Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы Междунар. науч. семинара (Минск, 2-3 апр. 2014 г.). – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; Москва : ФГБУ науки Научный и тздательский центр "Наука" РАН, 2014. – 148 с.

63. *Сынкова, І. А.* Мастацтва ўсходняй аправы: беларускія калекцыі ў кантэксце мусульнаскай традыцыі / І. А. Сынкова // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мінск, 2011. – [Вып. 3]. – С. 307–322.

64. *Цітавец, А. І.* Арабаграфічныя рукапісы канца XVII – першай палавіны XX ст. – крыніцы для вывучэння духоўнай культуры татараў Беларусі : аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук : 07.00.09 / Цітавец Алена Іосіфаўна ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі". – Мінск : Издательский центр БГУ, 2009. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Summary

*Larysa Doŭnar.* ***Belarusian Book History and Bibliology: Achievements and Needs***

*The main trends and tendencies of the development of the Belarusian book history as the bibliological research object in modern Belarus are considered, which, in retrospect, had a close relationship with the humanities, such as history, literature, linguistics, art history, philosophy, pedagogy, culturology, as well as with related disciplines - bibliography and library science. The problematic issues are analyzed and the new methodological approaches to the study of the Belarusian book and bibiliology history are revealed, their paradigmatic orientation to the category of book culture is marked. there is a paradigm of their orientation to such a category as a book culture. Attention is paid to the issue of the institutional research in the Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus, the National Library of Belarus, the Belarusian State University of Culture and Arts.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ